# Берасцейскі універсітэт

Брэсцкі дзяржаўны універсітэт імя А.С. Пушкіна

ВЫДАВЕЦ: установа адукацыі «БРЭСЦКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ ІМЯ А.С. ПУШКІНА»
**Выдаецца з 1997 года**

**№ 5 (125)**
Выходзіць 2 разы ў месяц
на беларускай і рускай мовах
17 лістапада 2009 года


## Сёння ў нумары:


✔ **Супрацоўніцтва працягнецца**
10 лістапада прайшла справаздачна-выбарчая канферэнцыя першаснай прафсаюзнай арганізацыі супрацоўнікаў універсітэта
стар. 2

✔ **Адчыняем дзверы**
Падрабязнасці з дня адчыненых дзвярэй, што адбыўся ва універсітэце 1 лістапада, чытайце на
стар. 2

✔ **З любоўю да факультэта**
Пра святкаванне 40-гадовага юбілею факультэта фізічнага выхавання шукайце інфармацыю на
стар. 3

✔ **Калі вецер гуляе**
Вынікі рэйду побытавай камісіі прафкама студэнтаў па факультэтах можна знайсці на
стар. 4

✔ **Наша служба і небяспечная, і цяжкая**
Інтэрв'ю з камандзірам моладзевага атрада аховы правапарадку універсітэта А. Лесакам змешчана на
стар. 6

✔ **Студэнту прысвячаецца**
стар. 8


# Студэнт, са святам!



***Дарагія студэнты!***

***Шчыра віншуем вас з «прафесійным» святам!***

*Дзень студэнта нездарма адзначаецца ва ўсім свеце. Студэнцкая моладзь была і будзе адным з самых адметных слаёў грамадства, той яго часткай, што заўсёды ідзе ў авангардзе. Гэта ў поўнай меры тычыцца і навучэнцаў нашай alma mater.*

*Будзьце і далей разумнымі, вясёлымі, крэатыўнымі, неардынарнымі, аптымістычнымі – такімі, якімі мы вас ведаем і любім!*

*Поспехаў вам у справах, за якія вы бярэцеся, цярпення ў вучобе і шчасця ў жыцці!*

## АБІТУРЫЕНТУ

# Адчыняем дзверы

**У мінулым нумары газеты мы абяцалі падрабязней расказаць пра дзень адчыненых дзвярэй, што прайшоў ва універсітэце 1 лістапада.**

Мерапрыемствы такога тыпу прызваныя, з аднаго боку, падштурхнуць абітурыентаў, што яшчэ не вызначыліся з вышэйшай навучальнай установай (ці нават прафесіяй), і, з другога боку, умацаваць рашэнне тых, хто спыніў свой выбар на нашым універсітэце.

Сакратар прыёмнай камісіі, дэкан факультэта замежных моў С.М. Севярын, спасылаючыся на нарматыўныя дакументы, даў абітурыентам неабходную інфармацыю аб прыёмнай кампаніі не толькі нашага універсітэта, але і сістэмы вышэйшай адукацыі краіны.

Сяргей Мікалаевіч расказаў пра спецыяльнасці, набор на якія будзе ўпешыню праводзіцца ў 2010 г. Гаворка ідзе пра спецыяльнасці «Інфармацыйныя тэхналогіі кіравання ў эканоміцы» і «Матэматычныя метады і інфармацыйныя тэхналогіі ў лагістыцы» на матэматычным факультэце; «Журналістыка», дадатковая спецыялізацыя «Літаратурна-выдавецкая дзейнасць» на філалагічным факультэце; «Сацыяльная псіхалогія», «Педагагічная псіхалогія», «Псіхалогія сямейных адносінаў» на псіхолага-педагагічным факультэце (дзённае навучанне).

З'явіліся новыя спецыяльнасці і для завочнікаў. Гэта тая ж «Журналістыка» на філфаку і 4 спецыяльнасці на факультэце фізічнага выхавання: «Трэнерская праца», «Фізкультурна-аздараўленчая і турысцкая дзейнасць», «Асновы лекавай фізкультуры», «Асновы фізічнай рэабілітацыі».

*(Працяг на старонцы 5)*

## АФІЦЫЙНА

# СУПРАЦОЎНІЦТВА ПРАЦЯГНЕЦЦА

***10 лістапада ў канферэнц-зале універсітэта прайшла справаздачна-выбарчая канферэнцыя першаснай прафсаюзнай арганізацыі супрацоўнікаў БрДУ імя А.С. Пушкіна.***

*У асноўным справаздачным дакладзе прафкама за 2004–2009 гг., які зрабіла старшыня прафкама супрацоўнікаў Л.Б. Чэлышава, прагучалі статыстычныя дадзеныя аб колькасці членаў прафсаюза ва універсітэце (дарэчы, лідэрамі ў працэнтным ахопе прафсаюзным членствам з'яўляюцца фізічны, матэматычны і сацыяльна-педагагічны факультэты – 90% ад агульнай колькасці работнікаў), праблемы і перспектывы працы прафкама па розных накірунках дзейнасці (абарона працоўных правоў работніка, ахова працы, работа з ветэранамі, удзел у вырашэнні жыллёвых пытанняў, фізкультурна-аздараўленчая, інфармацыйная работа і інш.). Старшыня рэвізійнай камісіі М.І. Шалонік пашырыла асноўны даклад фінансавай справаздачай.*

*З аналізам інфармацыйнага накірунку працы прафкама супрацоўнікаў выступіла выкладчык кафедры матэматычнага мадэлявання Т.С. Пратасевіч, а пра арганізацыю сумесных з прафкамам культурна-масавых мерапрыемстваў расказаў дырэктар студклуба Э.М. Севярын.*

*Рэктар М.Э. Часноўскі, хоць і з'яўляецца членам прафсаюзу, выступіў на канферэнцыі як сацыяльны партнёр гэтага грамадскага аб'яднання. Рэктар даў высокую ацэнку дзейнасці прафкама пад старшынствам Г.М. Варонінай і выказаў спадзяванне, што такое ж плённае супрацоўніцтва наладзіцца і з новым саставам камітэта. Пры гэтым быў выказаны рад пажаданняў для першаснай арганізацыі прафсаюзу універсітэта.*

*Гасцямі канферэнцыі былі намеснік старшыні Беларускага прафсаюзу работнікаў адукацыі і навукі Р.В. Дапіра, старшыня Брэсцкага абласнога камітэта гэтага ж прафсаюзу В.А. Харытановіч і старшыня Брэсцкага абласнога аб'яднання прафсаюзаў М.І. Басалай.*



***На фота: Р.В. Дапіра ўручае ганаровую грамату Беларускага прафсаюзу работнікаў адукацыі і навукі Г.М. Варонінай.***

## ШТО Ў СВЕЦЕ?

# ИНФОРМАЦИОННАЯ МОЗАИКА

Множество бывших и нынешних политиков из разных стран, около 100 тысяч туристов приехали в столицу Германии, чтобы принять участие в праздновании 20-летия падения Берлинской стены: 9 ноября барьер, разделявший на протяжении 28 лет город на две части, наконец рухнул.

Рядом с Бранденбургскими воротами была установлена новая, временная стена, изготовленная из тысячи пенопластовых блоков. Каждый из таких «кирпичей», 2,5 метра в высоту и 1 метр в ширину, был расписан художниками из разных стран на темы, связанные с миром и свободой. Рушить символическую стену начал экс-президент Польши Лех Валенса. Затем целых полчаса все блоки, один за другим, как домино, падали, пока последний из них не рухнул у Бранденбургских ворот.

Генсекретарь ООН Пан Ги Мун заявил, что падение Берлинской стены 20 лет назад изменило ход истории и стало победой простых людей, боровшихся за свободу. При этом многие немцы считают, что, хотя стена и пала, психологические барьеры остались и снять их будет намного сложнее, чем разрушить бетон.

• • •

11 ноября 1918 г. в Компьенском лесу было подписано перемирие между странами Антанты и Германией, что означало конец первой мировой войны. Называвшаяся ранее Праздником победы, теперь эта дата обозначена в календарях стран Европы как День перемирия. 91-я годовщина знаменательна тем, что впервые в истории главы победившей и проигравшей в войне стран были вместе. Спустя два дня после празднования в Берлине 20 лет со дня падения Берлинской стены (где присутствовал и Николя Саркози) Ангела Меркель нанесла ответный визит в Париж. Канцлер Германии и президент Франции возложили венок на могилу неизвестного солдата под Триумфальной аркой, символически дали новую жизнь Вечному огню и выступили с короткими речами. На церемонии присутствовали учащиеся военных академий, военнослужащие франко-германской бригады и ветераны более поздних военных конфликтов, т.к. последний французский участник первой мировой войны скончался в прошлом году.

• • •

10 ноября Президент Беларуси провёл совещание по совершенствованию национального избирательного законодательства. Особое внимание на совещании было уделено следующим предлагаемым нововведениям. Во-первых, планируется формировать избирательные комиссии (кроме Центризбиркома) таким образом, чтобы не менее трети в них составляли представители политических партий и других общественных объединений. Во-вторых, предлагается упростить выдвижение и регистрацию кандидатов. В-третьих, порог явки избирателей, необходимый для признания выборов местных Советов состоявшимися, будет исключён. Кроме того, предлагается расширить права наблюдателей, предоставив им возможность обозревать процедуру подсчёта голосов.

Практически все предлагаемые изменения были одобрены в том варианте, в каком были подготовлены Центризбиркомом.

# НАШЫ НАВІНЫ

***Студэнты 1–2 курсаў геаграфічнага факультэта 4 лістапада наведалі эколага-асветную акцыю «Эха экафорума «Экамір–2009», што праходзіла ў малой зале кінатэатра «Беларусь».***

***Акцыя засяродзіла ўвагу грамадскасці, прэсы, работнікаў дзяржструктур, выкладчыкаў школ і ВНУ на праблемах фарміравання новых форм экалагічнай адукацыі і культуры ўзаемаадносінаў чалавека і прыроды. Гледачам паказалі некалькі фільмаў з дакументальнага цыклу «Дзецям пра звярат»: «Пачуццё прыроды», «Дом для птушак» і інш., знятыя «Белвідэацэнтрам» у 2009 г.***

***Мерапрыемства арганізоўвалася Брэсцкім абласным камітэтам прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя сумесна з Беларускім саюзам кінематаграфістаў.***

• • •

***З 1 лістапада па 25 снежня на геаграфічным факультэце праводзіцца конкурс «Брэст: мінулае, цяперашняе, будучае», прысвечаны 990-годдзю горада над Бугам.***

***У конкурсе прымаюць удзел творчыя працы: фатаграфіі, калажы, тэматычныя серыі з некалькіх фотаздымкаў, малюнкі, пейзажы і т.п., якія адлюстроўвалі б асаблівасці і непаўторны воблік Брэста.***

***Арганізатар конкурса – кафедра гісторыі Беларусі.***

## ПАДЗЕЯ

# З любоўю да факультэта



*Ветэран факультэта Я.М. Шукевіч з жонкай — дацэнтам кафедры тэорыі і методыкі фізічнага выхавання Л.В. Шукевіч*

**40-гадовы юбілей адзначыў у канцы мінулага месяца факультэт фізічнага выхавання. Цэлы тыдзень – з 26 па 31 кастрычніка – быў насычаны разнастайнымі конкурсамі, спаборніцтвамі, турнірамі. Адбыліся, да прыкладу, эстафета «Лыжня», першынство факультэта па плаванні «Спрынт-2009», турнір па настольным тэнісе, сеанс адначасовай гульні ў шахматы з Г. Шарэвіч і шм. інш.**

Асаблівай увагі заслугоўвае ўрачыста-віншавальная праграма, што адбылася на факультэце 30 кастрычніка. Сімвалічнай і даволі арыгінальнай была задума арганізатараў правесці афіцыйную частку ўрачыстасці ў спартыўнай зале: як напамін гасцям, на юбілей якога факультэта яны запрошаны.

Насычаную і разнажанравую спартыўна-канцэртную праграму выдатна дапаўнялі шматлікія віншаванні.

М.Э. Часноўскі, рэктар універсітэта, назваў факультэт фізічнага выхавання тым каркасам, які забяспечвае ўмацаванне фізічнага здароўя ў вобласці, і ўручыў дэкану М.І. Прыступе падарачны сертыфікат на набыццё спартыўнага інвентара. Бурныя апладысменты – так банальна, але праўдзіва можна апісаць імгненную рэакцыю студэнтаў, якія пачулі велічыню (30 млн беларускіх рублёў) сертыфіката.

(Працяг на старонцы 7)

## ПРАФСАЮЗНАЕ ЖЫЦЦЁ

*Первичная профсоюзная организация студентов БрГУ имени А.С. Пушкина*
*profstud.brsu.brest.by*

# Начинаем с начала

**Эпидемия гриппа, которая наблюдалась в городе, не помешала профкому студентов 6 ноября провести семинар для профгрупоргов первого курса. Пришли все, кто не болеет. А таких оказалось много!**

Вопросы у вновь прибывших профсоюзных лидеров о своей деятельности в общественной организации начали проявляться задолго до объявления даты обучения. Энтузиазм и рвение студентов к возложенной на них работе прямо-таки поразили профсоюзный комитет.

Семинар прошёл под девизом «Учить профсоюзный актив – актуальная задача!». «Начинать надо с 1-го курса: как показывает практика, учёба профгруппоргов является залогом успешного функционирования всей профсоюзной организации университета», – отметила председатель профкома студентов И.А. Жак.




Сделать рассказ о профсоюзе интереснее и ярче помогла мультимедийная презентация «Основные направления работы профсоюзного комитета студентов», от которой присутствующие не могли оторваться. Инна Алексеевна также показала первокурсникам, как правильно вести дневник профгрупорга.

В работе семинара принимали участие проректор по воспитательной и социальной работе Л.А. Годуйко и заместитель председателя Брестского областного комитета Белорусского профсоюза работников образования и науки А.А. Драпей.

Надеемся, что эта встреча стала ещё одной ступенькой в развитии лидерских качеств профгрупоргов 1 курса.

*М. Буховецкая*
*(юридический факультет)*

# КОГДА ВЕТЕР ГУЛЯЕТ

**Как всегда, всё получилось неожиданно. Тёплые осенние деньки хоть и стояли довольно долго, но всё же быстро сменились неуютно-холодными.**

Но готовы ли мы к такому развитию событий? Чтобы выяснить, кто готов к наступающей зиме, а кто нет, бытовая комиссия профкома студентов провела по факультетам рейд-проверку.

Как оказалось, лучше всего умеют считать и, соответственно, экономить денежки университета физический и математический факультеты, а также факультеты учебного корпуса №2. На этих факультетах утеплены практически все окна.

К сожалению, этого не скажешь об остальных факультетах. Причём регресс хорошо прослеживается при движении вверх по лестнице главного корпуса. Если на третьем этаже кое-где и видна оклеечная бумага, то к седьмому этажу она встречается совсем редко.

Грустно смотреть на неоклеенные окна, когда сквозняк колышет тюль так, словно окно открыто. И мы, студенты, при этом жалуемся, что в аудитории холодновато!

Так давайте приложим усилия, чтобы исправить ситуацию, ведь настоящая зима-то не за горами…

*А. Богачук*
*(факультет иностранных языков, председатель бытовой комиссии профкома студентов)*

## ФОТАФАКТ

***31 октября на территории учебной базы «Орхово» прошёл субботник, в котором приняли участие студенты 1–2 курсов географического факультета. Основу группы составили волонтёры научно-экологического отряда «НеоГея».***

***13 человек на протяжении 5 часов убирали территорию базы от осенней листвы, мусора, битых кирпичей, носили доски, наводили чистоту и порядок.***

***Ребятам поездка пришлась по душе, особенно студентам 1-го курса. Ведь подобные акции помогают им влиться в дружный факультетский коллектив.***

*И. Гапонов*
*(географический факультет)*



АБІТУРЫЕНТУ

# Адчыняем дзверы

(Пачатак на старонцы 2)

Своеасаблівую рэкламу дзейнасці цэнтра «Прафарыенцір» зрабіла загадчык кафедры педагогікі дзяцінства М.С. Кавалевіч. Яна звярнулася да тых абітурыентаў, што сумняваюцца ў правільнасці выбару прафесіі або не зрабілі пакуль такі выбар. За пэўную плату цэнтр дапамагае выпускнікам сярэдніх школ вызначыцца ў гэтым няпростым пытанні.

А каб паказаць, што ў БрДУ імя А.С. Пушкіна студэнты не толькі вучацца, але і развіваюць свае творчыя схільнасці, а таксама каб проста ўзняць настрой перад сур'ёзнымі сустрэчамі з дэканамі факультэтаў, студклуб універсітэта падрыхтаваў для гасцей невялікі канцэрт.

На наш погляд, сустрэча змясціла ўсё, што неабходна для рацыянальнага і эмацыйнага знаёмства абітурыентаў з нашым універсітэтам. А як мяркуюць яны?

**Ксенія Абухова,** вучаніца СШ № 25 г. Брэста,

**Анастасія Дзімідовіч,** вучаніца Першамайскай СШ Бярозаўскага раёна.

**– Што прывяло вас сёння ў БрДУ імя А.С. Пушкіна?**

– Я вырашыла, што буду вучыцца на эканаміста. Засталося вызначыцца з ВНУ, хочацца пазнаёміцца з абодвума універсітэтамі Брэста.

**– Якіх цяжкасцей вы баіцеся пры паступленні ў вышэйшую навучальную установу?**

– Напэўна, усе, хто тут сабраўся, баяцца аднаго і таго ж: дрэнна здаць тэсціраванне. Мы не выключэнне.

**– Ці патрэбны такія мерапрыемствы, як дзень адчыненых дзвярэй, вам, абітурыентам?**

– Несумненна, патрэбны. Яны дапамагаюць нам зрабіць абдуманы выбар.

**Аляксандр Шалонік,** вучань Турнянскай СШ Камянецкага раёна:

**– Наколькі сённяшнія выступоўцы пашырылі вашы веды пра БрДУ імя А.С. Пушкіна?**

– Я даведаўся пра многае, шмат што чуў упершыню. Мне спадабаліся і сама сустрэча, і канцэрт.

Я дакладна вырашыў паступаць у ваш універсітэт.

*І. Хоміч*

РЫХТУЕМ КАДРЫ

# Клинический случай?

**Наш университет предоставляет уйму возможностей для реализации потенциала студентов. Одним из убедительных доказательств этого является организованная на юридическом факультете учебная лаборатория «Юридическая клиника».**



30 октября состоялось собрание студентов 3-го курса, на котором нас ознакомили с деятельностью «Юридической клиники» и пригласили поучаствовать в её работе в этом учебном году. Энтузиазм и интерес будущих юристов как никогда оказался высок. 51 заявление – результат агитационной работы, проведённой специалистами учебной лаборатории. И думаю, что это неокончательное количество желающих.

Преподаватели лаборатории изрядно шокированы такой массой заявлений, но они почему-то уверены, что некоторое количество записавшихся студентов всё-таки отсеется. Ведь работа здесь очень кропотливая, хоть и увлекательная, требующая знаний и умения применять эти знания на практике.

В «Юридической клинике» студенты в присутствии представителей Брестской областной коллегии адвокатов проводят консультирование лиц, отбывающих наказание в местах лишения свободы, малообеспеченных слоёв населения по правовым вопросам; самостоятельно готовят занятия на правовую тематику для школьников. Во время стажировки будущие юристы выезжают на следственные эксперименты, присутствуют на судебных заседаниях. Кроме того, они активно представляют нашу лабораторию на республиканском уровне.

Студент любит преодолевать трудности! Поэтому идите к цели, будущие специалисты!!!

*М. Буховецкая*
*(юридический факультет)*

*На фото: многие студенты написали заявления о приёме в*

ДЫЯЛОГ

# Наша служба и опасна, и трудна...

**На входе в аудитории и залы, где проходят важные университетские мероприятия, часто можно видеть симпатичных юношей и девушек. Если приглядеться к бейджам – непременному атрибуту их формы, можно прочитать, что молодые люди являются членами молодёжного отряда охраны правопорядка (МООП) БрГУ имени А.С. Пушкина, или, как его ещё называют, оперативного отряда. О его деятельности мы решили поговорить с командиром отряда, студентом юридического факультета Александром Лесаком.**

**– Расскажите, Саша, чем занимается отряд?**

– Основным направлением деятельности МООП является борьба с правонарушениями и профилактика противоправных проявлений. Так, например, мы участвуем в охране общественного порядка при проведении спортивных и культурно-массовых мероприятий, проводим индивидуальную воспитательную работу с «трудными» подростками, ведём пропаганду правовых знаний.

**– Но для того чтобы осуществлять такую деятельность, ребята должны быть хорошо подготовлены как физически, так и интеллектуально.**

– Вы правы. Этому аспекту у нас уделено особое внимание. Ежемесячно проходит правовая учёба членов МООП, которую ведут специалисты в данной сфере. В этом учебном году планируется проведение занятия «Как вести себя в ситуации уличного нападения?», занятия по изучению нормативно-правовых актов Республики Беларусь, связанных непосредственно с деятельностью молодёжных отрядов, и мн. др.

Чтобы поддерживать физическую форму, мы постоянно ходим на тренировки по овладению боевыми приёмами рукопашного боя.

**– Саша, а кто помогает вам организовать слаженную работу отряда?**

– Наш отряд курируют отдел воспитательной работы с молодёжью университета, полк патрульно-постовой службы милиции УВД г. Бреста и администрация Ленинского района г. Бреста.



**– Меня, как девушку, интересует такой вопрос: могу ли я стать членом вашего отряда?**

– Безусловно. Членом МООП может стать любой студент университета, достигший 18 лет, в хорошей физической форме и успевающий в учёбе, не привлекавшийся к уголовной и административной ответственности. Приём в отряд производится на добровольной основе, в индивидуальном порядке, на основании заявления с положительной характеристикой из деканата.

На данный момент отряд состоит из 10 парней и 1 девушки.

**– А в чём заключаются преимущества членов МООП в будущем?**

– Ребята пользуются приоритетом при прохождении срочной службы в Вооружённых силах Республики Беларусь и дальнейшем трудоустройстве в органы внутренних дел.

**– Я слышала, что недавно вы посетили следственный изолятор № 7 г. Бреста. Как впечатления?**

– Да, действительно. При поддержке заместителя председателя п/о «Белая Русь» университета Г.И. Иванчина мы побывали на экскурсии в СИЗО №7. Впечатления остались очень мрачные. По мере приближения к этому объекту увеличивалось жуткое ощущение неизвестного. Лязг металлических дверей, проход через пропускной пункт по три человека, замки, решётки и ограниченное пространство – всё это не прибавляло нам веселья. Лишь привычные действия охраны немного успокаивали, а вежливое отношение замначальника СИЗО напоминало, что мы всё же на экскурсии.

**– Планируются ли подобные мероприятия в будущем?**

– Да. Я считаю, что это полезная деятельность для отряда.

**– Саша, большое спасибо вам за интересный и содержательный рассказ. Желаю дальнейших успехов и пополнения ваших рядов.**

*А. Панасевич*
*(физический факультет)*

НА СВАЕ ВОЧЫ

# Окунуться в историю

**Любите ли вы путешествовать так, как любим мы?.. Любите ли вы открывать для себя новые места и расширять свои горизонты? Если да, я уверена: вам будет интересно узнать что-то новенькое…**

Недавно мы ездили на удивительно интересную экскурсию по Западной Беларуси. Сказать, что я была от поездки в восторге, – не сказать ничего. Потрясающей красоты старинные замки, усадьбы и храмы просто заворожили нас своей таинственностью. Войдя внутрь, ты окунаешься в их историю, переживаешь их жизнь.

Если вы не были в Гродно, то хотя бы слышали, что это невероятно красивый город. И это действительно так. Ведь Гродно – один из немногих городов Беларуси, в котором сохранился его исторический центр. Что ни здание – то история! Узкие городские улочки, выложенные брусчаткой, полуразваленные церкви и костёлы, дома-музеи знаменитых белорусских писателей и поэтов... Это и есть то, чем так привлекает любой город туриста.

Особое впечатление оставило посещение Коложской церкви на берегу Нёмана. Старинный храм был почти наполовину разрушен речными водами, но этот процесс вовремя остановили, а церковь достроили деревом. Сейчас это действующий приход. Лёгкое потрескивание свечей, запах ладана и неповторимый звук, создаваемый замурованными в стенах глиняными сосудами, в совокупности создают неповторимую, завораживающую атмосферу.

В поездке принимали участие преимущественно историки, которые готовили небольшие сообщения о каждом памятнике культуры и архитектуры. Рассказы ребят с радостью дополняли ксендзы, которые всегда радушно встречали гостей. Истории из их уст звучали намного интереснее и увлекательнее, ведь у некоторых из них почти вся жизнь связана с приходом. Поражает, что почти в каждом храме, даже самом отдалённом, всегда есть живые цветы, создающие атмосферу праздника.

Своей красотой и величием поразил храм в деревне Мурованка. Там мы познакомились и с местным населением. По дороге в церковь нас встретила жизнерадостная старушка, которая с энтузиазмом рассказывала молодёжи разные интересные истории, пела песни и танцевала.

Достаточно необычным образом был организован наш ночлег. Для меня это был первый опыт сна в спальном мешке, да ещё и на матах в школьном спортзале!!! Впечатления были слегка необычные. Лёгкий шок быстро сменился восторгом. Большое застолье, песни под гитару, хорошая компания… Разве может с этим что-нибудь сравниться!?

Как и любая другая, эта поездка оставила массу приятных впечатлений. Я надеюсь, что подобные экскурсии будут организовываться еще неоднократно. Главное, никогда не жалеть на такие мероприятия ни времени, ни денег. Поверьте, оно того стоит!

*Н. Курига*
*(юридический факультет)*



*Студенты внимают словам экскурсовода*

ПАДЗЕЯ

# З любоўю да факультэта

*(Пачатак на старонцы 3)*

Грашовы падарунак універсітэта не быў адзіны для факультэта фізвыхавання ў той вечар. Не з пустымі рукамі прыйшлі яго віншаваць начальнік упраўлення па фізічнай культуры, спорце і турызме Брэсцкага аблвыканкама М.М. Хевук і выканаўчы дырэктар прадстаўніцтва Нацыянальнага алімпійскага камітэта па Брэсцкай вобласці А.Л. Белаконенка. Што ж, вельмі дарэчы такія падарункі будучым алімпійскім чэмпіёнам!

А што на ФФВ рыхтуюць чэмпіёнаў – даўно вядомы факт. На працягу многіх гадоў студэнты факультэта прымаюць удзел у міжнародных спаборніцтвах. Прыносяць славу універсітэту і тады, калі перастаюць тут вучыцца. Таму на ўрачыстасць былі запрошаны як цяперашнія студэнты-чэмпіёны (М. Кунда, С. Паўлюковіч), так і слынныя выпускнікі (І. Барадзіч, Б. Ісачанка).

Падрыхтаваць чэмпіёна ці проста добрага настаўніка фізкультуры – задача, з якой выдатна спраўляюцца выкладчыкі факультэта. Нельга было не адзначыць іх працу, не сказаць адметныя словы ўдзячнасці ветэранам, не успомніць тых, каго ўжо няма ў жывых. Кранальна было глядзець, як моўчкі, не зговорваючыся, уставалі са сваіх месцаў першыя выпускнікі ФФВ пры ўшанаванні памерлых выкладчыкаў.

Мяне наогул здзівіла маналітнасць і арганізаванасць першага выпуску. Амаль палова яго прысутнічала ў зале!

Прыемна здзівілі і цяперашнія студэнты, якія ад пачатку да канца канцэртна-віншавальнай праграмы не стамляліся паказваць сваю бясконцую любоў да роднага факультэта і гонар за яго выхадцаў. Гэта, відаць, лепшая ацэнка любому факультэту.

Моцная сувязь традыцыйнага і новага – неабходная ўмова паспяховага функцыянавання ўсяго, што б ні ўзяць за прыклад. На факультэце фізічнага выхавання такая сувязь ёсць. Значыць, мы будзем ганарыцца яшчэ не адным пакаленнем выдатных трэнераў, настаўнікаў, спартсменаў і проста адданых роднаму факультэту людзей.

*І. Хоміч*

# Студэнту прысвячаецца!








Кадры студэнцкага жыцця лавіла Анастасія Макейчык (псіхолага-педагагічны факультэт)

## Анонс мерапрыемстваў да Дня студэнта

***16 лістапада***

*Адкрыццё тыдня геаграфіі на геаграфічным факультэце*

*«Кітайская вечарына» ў інтэрнаце №2*

***17 лістапада***

*«Я – студэнт» – флэш-моб*

*Універсітэцкі турнір па боўлінгу*

*Забаўляльная праграма «Вясёлы перапынак»*

*Конкурсная праграма ў інтэрнаце № 3 «З чаго ж зроблены нашы студэнты?»*

*Конкурсы караоке на геаграфічным і матэматычным факультэтах*

*Конкурс інтэлектуальных гульняў «Studiosus sapiens» на фізічным факультэце*

*«Студэнцкі капуснік» – святочнае мерапрыемства для студэнтаў факультэта замежных моў*

*Конкурс талентаў псіхолага-педагагічнага факультэта «Хвіліна славы»*

***19 лістапада***

*Універсітэцкі турнір па інтэлектуальных гульнях сярод студэнтаў 1-га курса «Вумнікі і вумніцы»*

***20 лістапада***

*«Фестываль народаў свету» на геаграфічным факультэце*

*Конкурс «Студэнт года» на псіхолага-педагагічным факультэце*

***26 лістапада***

*Універсітэцкі танцавальны конкурс «Гульня стыляў»*

## ПРОБА ПЯРА

*Я – кошка из квартиры сорок восемь,*
*Сплю целый день и очень редко ем.*
*Меня хозяин взял к себе и – бросил…*
*Нет, не на улицу, а ввёл в «игнор» совсем!*
*С утра он на работу: завязывает галстук,*
*Тарелку ставит на пол, чтобы поела я.*
*Приходит он с работы, и –*
*Это просто хамство,–*
*Со мной не пообщавшись,*
*Идёт к своим друзьям!*
*А ночью за компьютер*
*(Я трусь ему об ноги) –*
*И мутными глазами терзает монитор.*
*Потом уходит спать (я плачу на пороге),*
*Он вскакивает – хлоп дверью в коридор!*
*Хотела я уйти от этого мерзавца,*
*Как пару лет назад ушла его жена,*
*Но жалко мне: останется, несчастный,*
*Один в пустой квартире, где даже нет меня…*

**А. Альхименко**
(филологический факультет)



«Берасцейскі універсітэт» № 5 (125)

**Рэдакцыя:** рэдактар – І.А. Хоміч (тэл. 23–01–29).
Фота – А. Макейчык, Р.У. Хрыстафораў.
Карэктар – К.В. Каханчык, мастак – В. Шышчыц.
Куратар – Л.А. Гадуйка.
Газета падрыхтавана на настольнай выдавецкай сістэме РВА
БрДУ імя А.С. Пушкіна, 224665, г. Брэст, бульвар Касманаўтаў, 21.

Надрукавана на рызографе БрДУ імя А.С. Пушкіна.
224016, г. Брэст, вул. Міцкевіча, 28.
E-mail: gazeta_brsu@brsu.brest.by.
Падпісана ў друк 17.11.2009.
Аб'ём 1 ум. друк. арк. Тыраж 299 экз. Заказ № 654.
Рэдакцыя можа не падзяляць пункт погляду аўтараў артыкулаў.

***Газета запрашае да супрацоўніцтва студэнтаў, выкладчыкаў і спецыялістаў універсітэта***